ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 77 (1346) | СУБОТА, 4-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90
6 месяцаў . . . 1 р. 80
1 год . . . 3 р. 60
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыята—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэл. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Праверым выкананьне пастаноў X і IX зьездаў комсамолу

Сёньня, а 8 гадз. ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі склікаецца шырокая нарада юнкораў ударнікаў „Ч. З." па пытаньню агляду-праверкі выкананьня пастаноў комсамольскіх зьездаў Менскай організацыяй ЛКСМБ аб росьце

На нарадзе будзе прапрацаваны плян агляду праверкі і дадзены маршруты ўдарным брыгадам „Ч. З,".

Оргмасавы сэктар

Баявая задача

У Беларусі асабліва за апошнія два гады значна пашырылася сетка друкаваных газэт, шматтыражак (амаль у кожным раёне выдаецца друкаваная газэта) фабрычна-заводзкіх, насьценных—саўгасных, колгасных газэт. Павысілася іх роля, як організатараў у барацьбе за генэральную лінію партыі.

Аднак яшчэ у многіх газэтах, ня толькі насьценных, шматтыражках, але друкаваных газэтах, назіраецца рад буйных недахопаў. Вельмі павольнымі тэмпамі выконваецца дырэктыва ЦК УсеКП(б) аб нізавым друку.

Сёньня мы друкуем пастановы Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б аб організацыі масавага агляду-самаправеркі становішча нізавога друку, работы з рабсэлькорамі, становішча партыйнага кіраўніцтва друкам, аб папулярызацыі пастаноў усесаюзнай рабсэлькораўскай нарады і скліканьні ўсебеларускага рабсэлькораўскага зьезду.

У напрамку практычнага ажыцьцяўленьня гэтых баявых пастаноў партыі патрэбна зараз-жа разгарнуць работу па давядзеньню да шырокіх мас працоўных рашэньняў усесаюзнай нарады рабсэлькораў, па давядзеньню таго новага палажэньня ў рабсэлькораўскім руху аб тым, што „рабкор-ударнік, і організатар ўдарнікаў—становіцца цэнтральнай фігурай рабкораўскага руху а сэлькор-колгаснік-ударнік і організатар колгаснага руху—становіцца цэнтральнай фігурай сэлькораўскага руху".

З 15 красавіка па 15 мая будзе праводзіцца перавыбарчая кампанія рэдколегій фабрычна-заводзкіх, колгасных і вясковых нізавых газэт і шматтыражак. Гэтай кампаніі патрэбна надаць характар адказнай палітычнай кампаніі, увязаўшы яе з праводзімай зараз работай па організацыі ў кожным колгасе, брыгадзе насьценгазэт, шматтыражак з работай па падрыхтоўцы да ўсебеларускага рабсэлькораўскага зьезду.

Дырэктыва ЦК УсеКП(б) аб нізавым друку павінна быць абавязкова выканана безадкладна.

Неабходна падагуліць вопыт работы ўдарнікаў-рабсэлькораў, юнкораў-ўдарнікаў, брыгад. Новае у рабсэлькораўскім руху, высунута самім жыцьцём перад рабсэлькорамі—гэта тое, што зараз—„рабсэлькор ужо ня можа абмяжавацца тым, што ён бярэ пад абстрэл сваім пяром ход выкананьня тых ці іншых рашэньняў партыі і ураду. На даным этапе рабсэлькор, як перадавік у радох барацьбітоў павінен быць організатарам барацьбы за выкананьне гэтых рашэньняў, даючы сваімі адносінамі да працы узоры працоўнага героізму" (Постышаў).

Антысавецкая кампанія ў Японіі ня спыняецца

Заява тав. Карахана японскаму паслу пану Хіроту

(*Паведамленьне ТАСС*)

23-га сакавіка паўпрэд Японіі тав. Траяноўскі па даручэньню саюзнага ўраду ўручыў японскаму ўраду ноту протэсту ў зьвязку з замахам на камэрцыйнага саветніка Савецкага пасольства ў Японіі тав. Анікіева і прыняцьцем японскімі ўладамі неабходных мер к яго ахове. У ноце было падкрэслена, што перад замахам адбылася жорсткая анты-савецкая кампанія, кіруемая вядомымі коламі японскіх рыбапрамысловцаў, якія імкнуліся ўтварыць атмосфэру варожасьці к Савецкаму Саюзу і яго афіцыйным прадстаўнікам у Японіі.

Нота таксама звярочвала ўвагу японскага ўраду на заяву дырэктара фірмы „Нічыро" пана Хірафука, апублікаваную ў друку заяву, у якой кіраўнік фірмы, натхняючай антысавецкую кампанію друку, апраўдваў злачынны замах на тав. Анікіева і заклікаў да новых тэрорыстычных актаў супроць афіцыйных прадстаўнікоў СССР у Японіі.

У ноце была выказана надзея, што японскі ўрад будзе трымаць урад СССР у курсе ўсіх мер, якія ён прадпрымае ў мэтах усебаковага высьвятленьня абстаноўкі і акалічнасьцяй з маху на тав. Анікіева і прыцягненьня да адказнасьці ўсіх вінаўных у падрыхтоўцы да замаху, а таксама ў мэтах папярэджаньня паўтарэньня падобных актаў. З прычыны няпрыемнага адказу ад японскага ўраду на гэтую ноту, учора, 1-га красавіка, нам. Камісара замежных спраў тав. Карахан па даручэньню саюзнага ўраду зрабіў заяву японскаму паслу пану Хірота, у якой ён зьвярнуў увагу на тое, што на жаль, японскі ўрад да гэтага часу не адказаў на ноту савецкага ўраду ад 23-га сакавіка і выказаў надзею, што японскі ўрад улічыў нездавальненьне і абурэньне, якое выклікаў замах на тав. Анікіева ў СССР і што японскі ўрад не зразумее неабходнасьці правядзеньня ў жыцьцё мерапрыемстваў, указаных у ноце ад 23 сакавіка для утварэньня дружнай атмосферы, якая магла-б забясьпечыць хутчэйшае ўрэгуляваньне спрэчных пытаньняў між СССР і Японіяй.

Тав. Карахан адзначыў таксама ў сваёй заяве, што антысавецкая кампанія, якая адбывалася перад замахам на тав. Анікіева, ня спынілася і пасьля замаху і што СССР тым больш мае права разьлічваць, што японскі ўрад у бліжэйшы-ж час паведаміць аб тых задачах, якія ён прымае з мэтай папярэджаньня магчымасьці новых антысавецкіх актаў з боку безадказных элемэнтаў Японіі. (ТАСС)

„Вайну імпэрыялістычную—у грамадзянскую"

Фінляндзкія салдаты протэстуюць супроць падрыхтоўкі фашызмам антысавецкай вайны

ГЕЛЬСІНГФОРС, 1. У мясцовым судзе пачаўся процэс 1.200 левых профсаюзных організацый. У пачатку судовага пасяджэньня старшыня агаласіў протэст салдат, які паступіў у суд, супроць закрыцьця фінляндзкай профорганізацыі.

—„Мы рабочыя, апранутыя ў ваенную форм—гаворыцца ў протэсьце—рашуча протэстуем супроць гэтага нячуванага тэрору. Падрыхтоўваючыся да рабаўнічай вайны супроць Савецкага Саюзу вы для падрыхтоўкі тылу ўстанавілі у краіне фашысцкую дыктатуру. Для гэтай-жа мэты вы зачыняеце рабочую профэсыянальную організацыю. Але ў выпадку вайны мы ператорым яе у вайну грамадзянскую і пад кіраўніцтвам фінляндзкай компартыі створым Савецкую Фінляндыю".

Адозва заканчваецца заклікам да ўсіх рабочых і салдат далучыцца да протэсту і сумесна з компартыяй змагацца супроць фашысцкага тэрору.

Забойцам Лібкнэхта і Розы ня змыць свайго злачынства перад пролетарыятам

ПРАГА, 25. Старшыня Чэха-Славацкага Парламэнту, соц.-фашысты Соўкуп выступіў на старонках соц. дэмократычнай газэты з гнусным і цынічным артыкулам у якім адкрыта заяўляе, што адказнасьць за забойства Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург цалкам бяруць на сябе нямецкія соц.-дэмократы „Маладой рэспублікі, створанай нямецкай соц.-дэмократыяй—ціша Соўкуп—пагражала небясьпека быць задушанай ў абдымках рускага бальшавізму". Гэтым Соўкуп спрабуе апраўдаць забойства Лібкнэхта і Люксэмбург і тым самым лішні раз выкрывае гнусную ролю нямецкіх соц.-дэмократаў—гэтых прамых забойцаў правадыроў нямецкае рабочае клясы.

ТЭЛЕГРАМА МАКСІМА ГОРКАГА БАКІНСКІМ РАБОЧЫМ

БАКУ, 2. У сувязі з заканчэньнем нафтавай пяцігодкі Максім Горкі прыслаў тэлеграму наступнага зьместу: „Горача вітаю таварышоў рабочых Баку з вялізарнейшай перамогай. Тав. Сталін сказаў, што ў нас ёсьць усе аб'ектыўныя ўмовы для перамогі соцыялізму. Гэтыя ўмовы цалкам зводзяцца да дзьвёх: адна з іх—усьведамленьне рабочай клясай мэты сваёй героічнай працы, другая—усьведамленьне, што для працоўнай энэргіі няма перашкод, якіх яна не магла-б перамагчы. Вы, таварышы, выканаўшы пяцігодку за два з паловай гады, паказалі, што абедзьве гэтыя ўмовы ў вас у наяўнасьці.

Ваша перамога паслужыць натхняючым прыкладам для рабочых усіх галін прамысловасьці—здабываючай і апрацоўчай. Вашай перамогай вы яшчэ раз сказалі ворагам Саюзу Саветаў, як па-багатырску вырасьлі вы за 13 год, наколькі вялікая ваша сіла, як організавана воля.

Прывітаньне пераможцам! Шлях да перамогі становіцца ўсё свабаднейшым і шырэйшым.

Няхай жывуць пераможцы і іх правадыры! Максім Горкі"

Разрыў Аўстра-Югаслаўскай і Венгэрскай гандлёвай згоды

ВЕНА. 1. Аўстрыйскі урад аб'явесьціў аб разрыве 1 ліпеня 1931 г. гандлёвай згоды з Югаславіяй і Вэнгрыяй. Аўстрыйскія гаспадарчыя і аграрныя колы ўжо даўно патрабавалі зьнішчэньня гэтых дагавораў, ў зьмесьце якіх было шэраг абавязацельстваў, не дазваляючых правесьці ў жыцьцё павышэньне пошлін на хлеб і жывёлу, ўжо зацьверджаных аўстрыйскім парлямэнтам. Разрыў дагавору знаходзіцца таксама ў сувязі з заключэньнем аўстра-нямецкага мытніцкага саюзу, таму, што апошні прадугледжвае рэвізію ўсіх тых гандлёвых дагавораў, якія перашкаджаюць практычнаму правядзеньню ўраўненьня аўстрыйскіх і нямецкіх мытніцкіх тарыфаў.



На здымку: Дэмонстрацыя рабочых на вуліцах Вены. Колёна рабочых будаўнікоў.

Рабочыя Індыі рыхтуюцца да першамайскіх дэманстрацый

ЛЁНДАН. 1. З Індыі паведамляюць, што па ўсёй краіне рабочыя рыхтуюцца да першамайскіх дэмонстрацый. Падрыхтоўка вядзецца актыўней, чым калі небудзь. У шмат якіх гарадох выпрацоўваюцца праграмы рабочых дэмонстрацый у дзень 1-га Мая. Вялікую актыўнасьць праяўляюць чыгуначныя рабочыя

Конфэрэнцыя супроць „гаспадарча-палітычнай экспансіі Нямеччыны"

ВАРШАВА, 28. Польскі друк сур'ёзна абгаварвае высунуты Чэха-Славацкімі аграрыямі проэкт заключэньня мытніцкага саюзу паміж Польшчай і Чэха-Славакіяй. Друк паведамляе, што ў бліжэйшы час чакаецца скліканьне ў Варшаве конфэрэнцыі міністраў гандлю і прамысловасьці Польшчы, Чэха-Славакіі, Югаславіі, Румыніі і Грэцыі. Магчыма, што будуць запрошаны таксама Вэнгрыя, Баўгарыя. Гэта экономічная конфэрэнцыя, якая павінна будзе абгаварыць плян мытніцкай згоды накіравана супроць гаспадарча-палітычнай экспансіі Нямеччыны, пагражаючай палове Эўропы.

* * *

ВАРШАВА, 28. „Кур'ер Чырвоны" прыводзіць даныя, якія выразна характарызуюць упадак польскай буйной прамысловасьці. У працягу году колькасьць рабочых скарацілася з 446.217 да 368.450 чалавек. Поўны тыдзень у буйной прамысловасьці занята толькі 250.000 рабочых. Каля 100.000 рабочых працуюць некалькі дзён у тыдзень.

Павялічваюцца выпадкі гандлю нявольнікамі

СТАМБУЛ, 13.—Арабскія газэты паведамляюць аб больш частых выпадках гандлю нявольнікамі ў Палястыне. Многія бэдуіны вымушаны прадаваць дзяцей у нявольніцтва, каб расплаціцца з даўгамі.

Куды накіравана лязо франка-італьянскай марской згоды

Нядаўна паміж Францыяй і Італіяй падпісана ваенна-морская згода. Яна нібы-та адхіляе рознагалосьсі паміж абедзьвюма краінамі і папярэджвае небясьпеку новай імпэрыялістычнай бойні. Ці так гэта?

Італьянская буржуазія імкнецца заўладаць крыніцамі сыравіны (да рэчы і рынкамі збыту)—у Міжземным моры, на Балканах і Бліжнім Усходзе, фашысцкая Італія надзвычайна добра разумее, што гэта можа адбыцца толькі за рахунак Францыі і, разумеючы што францускі імпэрыялізм бяз бою нічога не аддасьць, ліхаманкава рыхтуецца да вайны.

Італьянскі фашызм не адмаўляецца вырашыць свае спрэчкі з Францыяй вайной. Але зараз фашысцкая Італія б'ецца у ціскох жорсткага гаспадарчага крызісу. Будаўніцтва вялікага флёту ёй не па плячу. Тым больш, што кожны лінкор абыходзіцца ў 70 мільёнаў рублёў. Італьянская буржуазія спадзяецца загоіць раны, нанесеныя крызісам з дапамогай буйной францускай пазыкі і таму яна пайшла на зьдзелку з Францыяй.

На чым-жа цяпер парашылі? За Францыяй застаецца вялікая перавага. Паводле падпісанай згоды, морскі флёт Францыі к канцу 1936 году будзе на адну трэцюю частку мацней Італьянскага. Але справа ня толькі ў роўнасьці флётаў.

У чым палітычны сэнс згоды?

У тым, што яна аднаўляе ранейшы саюз паміж Англіяй і Францыяй. Францускі імпэрыялізм мае намер, як відаць далучыць сюды і Італію. Ідуць перагаворы аб павялічэньні італьянскіх ўкладаньняў у Афрыцы, Англія ад згоды выгадала. Яна атрымала магчымасьць захаваць сваё панаваньне ў Міжземным моры, не прыбягаючы да пабудовы новых караблёў, а значыцца затратам агромністых сродкаў. Англія выгадала і тым, што становячыся на шлях дружбы з Францыяй, яна ўмацоўвае свае позыцыі ў адносінах да свайго небясьпечнага саперніка—Злучаных Штатаў.

Уступкі, якіх дабілася Францыя ад Італіі (падтрымка Англіі) развязвае рукі францускім імпэрыялістым, якія ліхаманкава рыхтуюць вайну супроць СССР. Францыя атрымлівае цяпер больш магчымасьцяй націснуць на Нямеччыну, каб ўцягнуць яе ў антысавецкі фронт.

Падпісаньне згоды прымусіла насьцярожыцца Злучаныя Штаты. Імпэрыялістычныя супярэчнасьці ня раз растройвалі ігру францускіх палітыкаў. Але як бы там ні было, нельга ні на хвіліну забываць, што лязо згоды накіравана на падрыхтоўку вайны супроць СССР.

Ангельскія соцыял-фашысты, якія стаяць на чале ўлады, трубяць аб другой сваёй перамозе. Пасьля нядаўнай конфэрэнцыі „Круглага стала", на якой Індыі была абяшчана куцая канстытуцыя, ім ўдалося дагаварыцца з правадыром індэйскай нацыянальнай буржуазіі Гандзі. Адпаведная згода нядаўна падпісана віцэ-каралём у Індыі, лёрдам Ірвінам і Гандзі. Індыйскія нацыянал-здраднікі ў асобе Гандзі пайшлі на ганебную здачу пазыцыі перад воляй ангельскага імпэрыялізму.

(*Працяг будзе*)

Кармовая база—ключ да вырашэньня проблемы жывёлагадоўлі

Комсамол! У паход за рэальную кармовую базу, за 40 тыс. га сілосных культур, за мільён тон сілосу!

Кармовы Перакоп павінен быць узяты

Паводле рашэньняў XVI Зьезду УсеКП(б) аб спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі, БССР павінна стаць раёнам інтэнсыўна разгорнутай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. БССР павінна ператварыцца ў краіну вырабу мяса і малака, і стаць асноўным сьвінагадоўчым раёнам Савецкага Саюзу.

Пленум ЦК ЛКСМБ, які нядаўна адбыўся, вынёс наступную пастанову: „Каб вырашыць проблему жывёлагадоўлі, неабходна падвесьці кармовую базу. Дзеля гэтага трэба садзейнічаць палепшаньню лугавых угодзьдзяў за лік асушкі балот, пашырыць плошчу пасеву кармовых траў за лік скарочанага выпанага папару. Пашырыць пасеў сілосных культур, забясьпечыўшы ў гэтым годзе ня менш 1 мільёну тон сілоснай масы“.

Гэтая пастанова зьяўляецца баявым заданьнем да конкрэтнай практычнай работы комсамольскай арганізацыі. Трэба па-ўдарнаму, па-баявому мобілізавацца ў паход за корм. „Барацьба за корм становіцца зараз важнейшай палітычнай справай кожнага колгасьніка, кожнага партыйца, комсамольца ўсёй савецкай грамадзкасьці“. (З адозвы Цэнтральнага Кармовага Штабу).

Конкрэтным лёзунгам, пад якім комсамольскім организацыям трэба змагацца за кармовую базу зьяўляецца—барацьба за 40 тыс. га пасеўнай плошчы пад кармовымі і сілоснымі культурамі і за 1 мільён тон сілоснай масы.

Для выкананьня гэтага лёзунгу комсамольскім організацыям неабходна організаваць ударныя брыгады комсамольцаў, колгасьнікаў, школьнікаў, піонэраў для збору гальлёвага корму. Стварыць ініцыятыўныя рацыяналізатарскія групы па эканоміі і вышуканьні ўнутраных рэсурсаў корму.

Праверце ход падрыхтоўкі да засеву насенных траў, караньплодаў, наліччa насеньня, інвэнтару. Забясьпечце пашырэньне пасеўных плошчаў для кармовай базы, забясьпечце поўнае выкананьне плянаў.

Сілос—асноўны вагар у стварэньні кармовай базы.

Баявая задача комсамолу—узяцца зараз-жа, з вясны, за падрыхтоўку і правядзеньне сілоснай кампаніі, змагацца за 1 млн. тон сілосу—і ні на кгр. менш!

РК, ячэйкі, організуйце ініцыятыву і энтузіязм колгасьнікаў, бядняцкай, серадняцкай моладзі і піонэраў на змаганьне за корм, за соцыялістычную жывёлагадоўлю. Організуйце і шырэй разгарнеце соцыялістычнае спаборніцтва на большую колькасьць і лепшую якасьць кармовай базы. Організуйце спэцыяльна кармовыя ўдарныя групы, штурмавыя брыгады, грамадзкі буксір і сустрэчныя пляны.

Юнкораўскія брыгады—юнкоры! Уключайцеся на барацьбу за корм. Выкрывайце і разьбівайце ўсе перашкоды.

Кармовы Перакоп павінен быць узяты.

Перакрыць заданьне на 150 тыс. тон

Па пастанове Саўнаркому БССР к канцу 1931 году агульны гурт для колгасаў па аграмаджаным і неаграмаджаным сэктары буйнай рагатай жывёлы павінен быць даведзены да 1.063.000 галоў. Сьвіны гурт—да 1.020.000 галоў. Птушкі—89.000. Таварнай продукцыі колгасы павінны даць у 1931 годзе 123.000 галоў, сьвіней—180.000 галоў, птушак—72.000, яек—514.000 штук.

Для забясьпечаньня такой колькасьці жывёлы патрэбна пэўная кармовая база.

Паводле проекту Белкалгасцэнтру пасеўплошча патрэбна наступная:

Сенажаці павярхоўнага палепшаньня—150 тыс. га.

Сенажаці карэннага палепшаньня—13 тыс. га.

Кармовых аднагадовых траў—99 тыс га.

Канюшыны—119 тыс. га.
Караньплодаў—32 тыс. га.
Сілосных культур—20 тыс. га.
Бульбы—217 тыс. га.

Саўнаркомам БССР для колгаснага сэктару дадзена заданьне мець—502 тыс. тон сілоснай масы, пабудаваць вежаў 165 ёмкасьцю ў 40-45 тыс. тон. А рэштку заданьня засілосаваць у ямах.

Гэта заданьне ўраду зьяўляецца мінімальным. Ёсьць усе магчымасьці перавыканаць гэта заданьне на 150 т. тон.

Задача комсамолу будаваць так усю сваю работу, каб гэтую програму выканаць і перавыканаць.

За 1930 год плян сіласаваньня быў выкананы толькі на 10 проц. Здавалася-б, гэта павінна навучыць нашы гаспадарчыя організацыі ўзяцца сёлета па-баявому за кіраўніцтва і практычнае ажыцьцяўленьне програмы кармовай базы, каб і ў гэтым годзе не паўтараць памылак мінулага году.

На самой справе ня так. Белколгасцэнтр ня ведае колькі дакладна патрэбна засеяць кармовых і сілосных культур, няма яшчэ разьлікаў, колькі на адну штуку жывёлы якіх культур пасеяць. Кармовы р цыён, ёсьць, але гавораць—мы яго ўдасканальваем і на месцы дагэтуль не разасланы. Мясцовыя работнікі ня могуць практычна вылічыць колькі і якога корму ім патрэбна па наяўнасьці гурту. З вышэй прыведзеных лічбаў пасеўплошчы ў Белколгасцэнтру няма поўнай упэўненасьці ў тым, што яны здаволяць кармамі наяўнасьць гурту.

Зводак з месц аб становішчы загатовак пасеўматар'ялу для кармовых і сілосных культур Белколгасцэнтр ня мае. Ды і сам Белколгасцэнтр у гэтай справе плавае. Увесь час проектуюць, зьмяняюць, перакройваюць і гэтым самым дэзорыентуюць мясцовыя колгасныя організацыі. Час спыніць гэту сьвістапляску лічбаў і габінэтнае проектаваньне.

Загатоўка будматар'ялаў для скотных двароў, сьвінарнікаў ды інш. у выключна дрэнным становішчы. Гэта ўтварае пагрозу, што калі пачнуцца вясеньнія работы, колгасы ня будуць мець магчымасьці загатовіць будматар'ялы і забясьпечыць будаўніцтва цягавай і рабочай сілай. Утвараецца прамая пагроза зрыву будаўнічага сэзону. Зараз-жа трэба біць трывогу перад усімі організацыям і перад масамі колгасьнікаў аб такім становішчы падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону.

Дзяржплян абяцае забяспечыць будаўніцтва цьвікамі ў колькасьці 35 проц. ад таго, што патрабуецца. Аб гэтым Белколгасцэнтр ня сыгналізуе перад колгасамі, ня ўжывае захадаў для таго, каб на мясцох колгасы самі вышуквалі свае ўнутраныя запасы.

Задача комсамольскіх організацый у тым, каб зараз-жа, не паволячы, узяцца за праверку, таго як кожны колгас, савгас забясьпечыць свой гурт кармовымі сілоснымі культурамі.

Ці дастаткова запроектавана плошча для наяўнасьці жывёлы? Дабіцца, каб колгас, савгас павялічыў плошчу пасеву кармовых сілосных культур і плошчу палепшаньня сенажацяй. Організаваць брыгады з комсамольцаў-колгасьнікаў, абвясьціўшы паход за выкананьне і перавыкананьне пляну збору пасеўматар'ялу, за загатоўку будматар'ялу і мобілізацыю ўнутраных рэсурсаў колгасу на будаўніцтва. Ячэйкі павінны разьбіць сьпячку, зламаць усе опортуністычныя перашкоды ў правядзеньні сілосна-кармовай кампаніі.

Мы патрабуем:

Ад Белколгасцэнтру, Сьвінаводколгасцэнтру, Белсельтрэсту безадкладна і канчаткова давесьці рэальныя пляны пасеву сілосных кармовых культур, рацыёну кармленьня да раёну, да колгасу, да савгасу.

Гарштабу „лёгкай кавалерыі“ г. Менску правесьці налёты-рэйды на цэнтральныя ўстановы Белколгасцэнтру, Бельсельтрэсту, Сьвінаводколгасцэнтру. Белсельбуд, выявіць як яны праводзяць падрыхтоўку да правядзеньня с лосна кармовай кампаніі.

Комсамольцам Менскага і Гомельскага дрэваапрацовачных заводаў правесьці ўнутрызаводзкія рэйды па праверцы выкананьня заказаў па вырабу стандартных сілосных веж. Несваячасовым выкананьнем заказаў зрываецца сіласаваньне. Першую партыю—46 вежаў адгрузіць на месцы будаўніцтва да 15 красавіка.

Штаб сілоснага паходу пры ЦК ЛКСМБ павінен прыняць рашучыя захады для мобілізацыі ўсёй комсамольскай організацыі ў паход за сілос,

Логвін

Лепшыя сілосныя расьліны для ўмоў БССР і тэхніка іх культуры

Пытаньне загатоўкі корму шляхам сіласаваньня набывае вялікае значэньне і прыцягвае да сябе асаблівую ўвагу. Сілос—магутны сродак у вырашэньні кармовай проблемы.

Сіласаваньне з кожным годам усё больш і больш ужываецца, а ў зьвязку з тым паўстае пытаньне, якія расьліны лепш сеяць для сіласаваньня,—бо асноўная сіласуемая зялёная маса павінна атрымлівацца ад спэцыяльна пасеяных расьлін з скарыстаньнем адкідаў палявадзтва і гароднітва.

У БССР лепшаю расьлінаю зьяўляецца кукуруза і асабліва ў паўночных раёнах. Для паўднёвых раёнаў перавагу мае кукуруза (кіякі), якая таксама можа добра расьці і ў паўночных раёнах, але павінна мець меньшую ўраджайную вагу, чым сланэчнік.

Кукуруза зьяўляецца лепшаю сіласною расьлінаю з усіх сілосных культур, па сваёй спажыўнай вартасьці.

Як-жа культываваць кукурузу? Глебу пад кукурузу трэба араць па магчымасьці глыбей, бо карэньні кукурузы могуць пранікаць у зямлю на 18-20 см. і больш. Кукуруза патрабуе добрае глебы, напрыклад, з пад бульбы, лёну, на якую надоўна было паложаны гной.

Калі глеба не ўзарана ўвосень, дык патрэбна ўзараць раньняю вясною і к часу сяўбы кукурузы глеба падрыхтуецца. Перад пасевам глеба баранецца спружыноўкаю і на падрыхтаванай такім чынам глебе можна праводзіць самы засеў.

Лепшым часам сяўбы трэба лічыць пэрыод, калі пачынаюць цьвісьці фруктовыя дрэвы. Сеецца кукуруза шырокімі міжрадзьдзямі ад 60—85 см, з тым, каб можна было рабіць прапашку ў часе росту. Адлегласьць у радох паміж асобнымі расьлінамі павінна быць 15—18 см.

Для сяўбы кукурузы можна скарыстаць звычайную сеялку з камачным высеваючым апаратам „Эльворці“, але лепш за ўсё высяваць спэцыяльнымі сеялкамі, якія для гэтай мэты прыстасаваны.

На адзін гектар кукурузы высяваец па 80 кгр. Сярэдні ўраджай кукурузы з га 35—40 тон зялёнай масы. Лепшым часам уборкі кукурузы на сілос трэба лічыць малочную сьпеласьць зярнят, калі ніжняе лісьце сцяблю пачынае жаўцець.

Лепшым гатункам кукурузы для сілосу зьяўляецца „конскі зуб“.

Сланэчнік, як і кукуруза, патрабуе тэй-жа падрыхтоўкі глебы і мае амаль тую-ж кармавую вартасьць. Сланэчнік не баіцца ранніх замаразкаў і таму трэба высяваць як мага раней, бо ён чым раней пасеяны, тым большы будзе ўраджай. Лепшым насеньнем сланэчніку на сілос лічыцца „грызовой“ і „кубанскі гігант“. Норма высеву на га—25 кгр.

Пасеў праводзіцца радовы, паміж радамі павінны быць адступы 50-75 см. і ў радох 8—10 см. Пры адсутнасьці спэцыяльнай сеялкі пасеў сланэчніка можна рабіць звычайнай радавой сеялкай. Уход за сланэчнікам такі-ж, як і за кукурузай. Культываваньне ці ачуваньне сланэчніка, як і кукурузы, за лета трэба правесьці разы два-тры.

Уборка сланэчніка на сілос вытвараецца ў канцы малочнай сьпеласьці. Ураджай зялёнай масы ў сярэднім 40 тон з га і вышэй.

Побач з гэтымі двума культурамі на сілос магчыма ўжываць земляную грушу, як вельмі каштоўную расьліну, капусту, конскія бабы і інш.

А. Даніловіч.

Пераключыцца на пасеўфронт

Комсамолія чыгуначнага вузла станцыі Менск—МББ, як відаць, забылася аб тым, што яна павінна прыняць удзел у правядзеньні веснавой пасеўкампаніі.

Комсамольскія ячэйкі: дэпо, экіпэтацыі, малога рамонту вагонаў навет не абгаварылі гэта пытаньне. Масавыя сэктары заглохлі,—не працуюць.

На вузьле гіне шмат попелу ад паравозаў, печак і г. д. Падшэфныя колгасы і прыгарадныя саўгасы і фэрмы, якія знаходзяцца блізу вузла, маглі-б скарыстаць гэты попел для ўгнаеньня, але організацыі вузла аб гэтым не думаюць.

Вузлавы комсамольскі колектыў павінен адацаніць палітычную важнасьць удзелу ў пасеўкампаніі і па-баявому разгарнуць конкрэтную работу.

К. А.

НАНЕСЬЦІ РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА ОПОРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ

Выканаць плян контрактацыі і загатоўкі малака!

Контрактацыя і загатоўкі малака ўскладзена на Белмолжывёласаюз і Белкоопсаюз. Што-ж конкрэтна зроблена імі ў гэтай галіне?—Амаль нічога. Белмолжывёласаюзам на 20 сакавіка ахоплена контрактацыяй у індывідуальным сэктары ўсяго 16,2 проц., у колгасах—75 проц. і кулацка-заможных гаспадарках—16,6 проц. Паступіла-ж малака па тых зьвестках, якія маюцца, ад колгасаў і індывідуальнага сэктару ўсяго 2 проц., ад кулацка-заможных гаспадарак—нічога.

Па Белкоопсаюзу ахоплена контрактацыяй у 23 раёнах—па індывідуальным сэктары 15 проц., па колгасах 6 проц. і кулацка-заможных гаспадарках 1,5 проц., з якіх нічога не наступіла. У той час, як тэрмін выкананьня дагавароў па контрактацыі скончыўся яшчэ 15-га сакавіка, і на сёньнешні дзень мы маем амаль поўнае невыкананьне плянаў асобнымі організацыямі. Паказаныя лічбы сьведчаць аб тым, што праца належным чынам ня была разгорнута. Белмолжывёлсаюз нават ня ведае, што канкрэтна зроблена на месцы ў адносінах да кулацка-заможных гаспадарак, якія ухіляюцца ад здачы.

Белкоопсаюз толькі 28-га сакавіка, калі убачыў, што праца фактычна сарвана, разаслаў тэлеграмы раёнам аб узмацненьні тэмпаў контрактацыі малака, і 31-га сакавіка мобілізаваў ў раёны 25 працаўнікоў МЦРК.

З боку Савгастрэсту таксама ня зьвернута належнай увагі па гэтаму пытаньню. Асобныя колгасы выдаткоўваюць малочныя продукты на свае патрэбы звыш дадзенай нормы, не падпарадкуючыся пастановам і паказаньням на конт гэтага, з 115 савгасаў да гэтага часу Саюз малако не атрымала ніякіх зьвестак. За 1-ю дэкаду сакавіка прыслалі зьвесткі толькі 9 савгасаў, на другую—8, на 1-е красавіка толькі 4 савгасы. Астатнія лічаць нават непатрэбным паведаміць як імі выконваецца плян.

Студзенскі пленум ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах адзначыў, што контрактацыя і загатоўка малака і малочных прадуктаў зьяўляецца важнейшым гаспадарча-політычным заданьнем. Пленум абавязаў усе загатоўчыя організацыі і РК дабіцца максымальнага павялічэньня загатовак малака і малочных продуктаў. Між тым, рад райкомаў партыі і райвыканкомаў, як-та: Крупскі, Быхаўскі, Хоцімскі, спасылаюцца на розныя об'ектыўныя прычыны (перагрузка, кампаніі і г. д.), ня ўжылі патрэбных захадаў для пасьпяховага выкананьня плянаў контрактацыі і загатоўкі малака і не давялі пляны да кулацка-заможных гаспадарак.

Абураючы факт опортуністычнай недаацэнкі контрактацыі і загатоўкі малака паведамляе брыгадзір з Хоцімскага раёну. Калі зьвярнуліся да сэкратара Хоцімскага РК КП(б)Б тав. Мірыненка за дапамогай для ўзмацненьня тэмпаў загатовак, дык ён адказаў: „Калі контрактуем кароў, дык нельга контрактаваць малако, а калі контрактуем малако, дык нельга контрактаваць кароў“. Таксама бязьдзейнічае Быхаўскі РВК і райком партыі.

Трэба з усей бальшавіцкай рашучасьцю ўдарыць па гэтых фактах опортуністычнай практыкі і ўжыць рашучыя захады дзеля ліквідацыі прарыву ў выкананьні пляну загатовак і контрактацыі малака. Трэба ўжыць тэрміновыя меры для ўзмацненьня працы загатоўчых організацый, спыніць уцечку малака на прыватны рынак.

Комсамольскія організацыі павінны пераключыць сваю працу на практычную дапамогу загатоўчым організацыям, кінуць усе сілы на пасьпяховае правядзеньне контрактацыі малака і малочных продуктаў, узяць пад контроль працу загатоўчых організацыі.

Побач з гэтым ЦКК-РСІ павінен разглядзець гэтую справу і прыцягнуць вінаватых за зрыў контрактацыі малочных продуктаў да адказнасьці.

Юрка К-ч

З 335 ГА НІЧОГА НЕ ЗАКОНТРАКТАВАЛІ

МЕНСК. Праца па контрактацыі ў прыгародным сельсавеце яшчэ не распачата. Адозва ЦК і СНК не даведзена да шырокіх працоўных мас. З пратрэбных па пляну законтрактаваць 335 га яравых культур, на якіх 135 га гародных культур, ні воднага гектару не законтрактавана. Сельсавет і комсамольская ячэйка бязьдзейнічаюць.

Г. Фрыд

ПЛЯН ДА ВЁСАК НЕ ДАВЕДЗЕНЫ

БАБРУЙСК. У Кавалёўскім сельсавеце да гэтага часу ня прыступілі да контрактацыі. Пляны да вёсак і гаспадарак не даведзены. Растлумачальнай работы не праводзіцца. Колгасы „Пролетары“, „Наэя Лебэн“ не законтрактавалі ніводнага га. Комсамольская ячэйка бязьдзейнічае. Гэта політычна-гаспадарчая кампанія праходзіць па-за яе увагай,

Брыгадзір—Б. Фельдман

Суровая вымова за бязьдзейнасьць у рабоце па контрактацыі

Пастанова праўленьня Белільнасаюзу

За праяўленую бязьдзейнасьць у рабоце па контрактацыі абвясьціць суровую вымову з абвяшчэньнем у друку праўленьням Чавускага і Чырвонапольскага райкоопсаюзаў.

Сэкратар праўленьня Прэабражэнскі.



Барацьба за выкананьне фінпляну ёсьць непарыўная частка барацьбы за выкананьне 5-годкі ў 4 гады.

Зьвесткі з месц сьведчаць аб тым, што па шэрагу раёнаў ёсьць яўны прарыў у галіне барацьбы за выкананьне фінпляну. Нядбайныя адносіны да гэтай важнейшай гаспадарча-політычнай справы, яўная опортуністычная недаацэнка яе, казённае благадушша і бюрократычныя адносіны даводзяць да вялікіх прарываў на гэтым фронце.

Дагавор комсамолу Беларусі з Украінай абавязвае беларускую комсамолію накіраваць усе сілы на барацьбу за выкананьне пляну мобілізацыі ўсіх сродак на фронт выкананьня плянаў 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Зьмяшчаючы першую опэрацыйную зводку з фронту барацьбы за фінплян, мы чакаем весткі з месц аб ходзе барацьбы за выкананьне фінпляну, весткі аб тым, як выконваецца дагавор і пастанова ЦК ЛКСМБ, як комсамолія рэалізуе баявы загад партыі і ўраду.

Дагавор з Украінай павінен быць выкананы. Неабходна накіраваць усе сілы на гэты фронт, забясьпечыўшы поўнае выкананьне і перавыкананьне ўдарнага фінпляну 3-га году пяцігодкі.

Забясьпечыць баявую работу

Давесьці фінплян да сельсавету

Плян мобілізацыі сродкаў першага кварталу ня выкананы. Гэта патрабуе асабліва напружанай работы ў другім квартале. Кампанія па сяўбе і колектывізацыі ні у якім разе не павінна адсоўваць барацьбу за фінплян і мобілізацыю сродак. Малейшае паслабленьне работы ў другім квартале сарве выкананьне пляну і створыць вялікія цяжкасьці.

ЦК патрабуе ад усіх комсамольскіх організацый організаваць праверку сваячасовага давядзеньня пляну мобілізацыі на другі квартал да сельсавету і забясьпечыць баявую работу з першых дзён красавіка на працягу ўсяго кварталу.

Наша задача—у красавіку поўнасьцю пакрыць недабор першага кварталу. Асаблівую ўвагу зьвярнеце на плацяжы па пазыцы і ашчадным касам. Акажэце максымальнае садзейнічаньне фінорганам у справе выкананьня рашэньняў ЦК партыі аб умацаваньні кадрамі фінансавай сыстэмы. Частку комсамольцаў перадайце на сталую работу у фінапарат, камандыруйце комсамольцаў для ўкомплектаваньня фінкурсаў.

Сэкратар ЦК УсеЛКСМ Косараў

Злачынна забыты вучастак

Фінплян па Барысаўшчыне—забыты вучастак працы. Гэтым пытаньнем не займаецца ніводная організацыя.

Студзеньскі плян выканан на 60,2 проц, лютаўскі—на 50,8 проц. Гэтыя трывожныя лічбы ня прымусілі вашы партыйна-прафсаюзныя і комсамольскія організацыі заняцца выкананьнем кантрольных лічбаў фінансавага пляну.

Аднаразовы збор паступае надзвычайна марудна. Ёсьць сельсаветы, якія выканалі збор толькі на 29,9 проц. (Бродаўскі).

На самаабкладаньню асабліва ганебна адстае Касьцюкоўскі сельсавет—выканаў заданьне на 19,3 проц. Надзвычайна вялікі прарыў і ў ашчадсправе,—квартальны плян за два месяцы выканан на 35,3 проц.

Аб тым, што пляны рэальныя, што пры дастатковай працы яны могуць быць перавыкананы сьведчыць работа наступных сельсаветаў, якія перавыканалі заданьні па мобілізацыі сродкаў (Лозінскі, Лельчыцкі, Жытлаўскі).

Кугель.

Фінплян—па-за ўвагай РК ЛКСМБ

Жлобінскі РК ЛКСМБ толькі 10 дзён таму назад давёў да ячэек кантрольныя лічбы па мобілізацыі сродкаў, ды і то габінэтным парадкам. Рашэньне ЦК ЛКСМБ па гэтаму пытаньню не абгаварвала ні адна ячэйка.

РК ЛКСМБ абмежаваўся тым, што 20-І вынес пастанову аб мобілізацыі сродкаў, але да гэтага часу не паклапаціўся праверыць, як яна выконваецца.

Калі брыгадзір ЦБ ЛКСМБ зьвярнуў увагу сакратара райкамолу т. Шаўцова на тое што неабходна склікаць комсамольскі актыў і мобілізаваць увагу ўсёй комсамольскай організацыі на выкананьне соц. умовы з Украінай, дык ён палічыў гэта непатрэбным.

А кантрольныя лічбы першага кварталу ў Жлобінскім раёне ня выкананы. Гэта характарызуе праваопортуністычную практыку райкамолу ў мобілізацыі фінансавых сродкаў.

Гольдзін.

Дагавор выканаем

ВЕТКА. 1. Веткаўская саматужна-вытворчая ячэйка ЛКСМБ уключылася у паход за выкананьне дагавору паміж ЛКСМБ і ЛКСМУ па мобілізацыі сродак, у прыватнасьці па ашчадсправе.

27 сакавіка комсамольскім сходам з удзелам беспартыйнай моладзьдзю было шырока абгаворана пытаньне мобілізацыі сродак па соцыялістычнаму будаўніцтву. Усе комсамольцы сталі ўкладчыкамі ашчадкас.

На гэтым-жа сходзе комсамольцамі і беспартыйнай моладзьдзю былі дадзены абавязацельствы аб унясеньні чарговага ўкладу у ашчадкасу на агульную суму 369 руб.

Акрамя гэтага дадзена заданьне кожнаму комсамольцу завербаваць па тры укладчыкі і весьці штодзённую растлумачальную працу у арцелях. Ячэйка прыступіла да рэалізацыі акцый трактарацэнтру, вылучаны тавары для правядзеньня гэтае работы. Комсамольцы адзінадушна заявілі, што дагавор будзе выкананы.

Пост „Чырвонай Зьмены“ Жыранаў і Грамыка

Бальшавіцкія справы

Лельчыцкая організацыя ЛКСМБ узяла шэфства над ўсёй сеткай раённых ашчадкас. Тры ашчадкасы ўкомплектаваны лепшымі комсамольцамі, організавана адна паказальная комсамольская ашчадкаса.

Дадзенае ячэйкам на першы квартал заданьне ўцягнуць фінансавых ўклады перавыканана на 16 проц.

Дзеля далейшага ўзмацненьня працы, у кожнай ячэйцы ўтвораны пасты па мобілізацыі сродкаў: надпіскі на трактарныя акцыі і на пазыку „5-ка ў чатыры гады“.

Куцанаў.

Выканаць фінплян—баявы загад прафсаюзам!

Ня гледзячы на рад рашэньняў ЦСПСБ аб мобілізацыі фінансавых сродкаў прафорганізацыі да гэтага часу не правялі максімуму увагі і і ня ўжылі даволі рашучых мер, каб выраўняць гэту важнейшую задачу.

У прафорганізацыях наглядаюцца дэмобілізацыйныя настроі, недапушчальная надбайнасьць, непераадолімасьць кіраўніцтва вакол мобілізацыі самых шырокіх працоўных мас на гэты важнейшы вучастак работы.

ЦСПСБ абавязвае прыняць самыя рашучыя меры і ўзяць сапраўды бальшавіцкія тэмпы у мобілізацыі мас, каб забясьпечыць пакрыцьцё запазычанасьці 1-га кварталу і выканаць плян 2-га кварталу.

ЦСПСБ папярэджае, што ўсякае паслабленьне работы прафорганізацыі у гэтым важнейшым політычным мерапрыемстве будзе расцэньвацца, як праўленьне правага опортунізму.

Адказнасьць за правядзеньне ўсёй гэтай важнейшай работы, за мобілізацыю шырокіх мас працоўных, за разгортваньне рашучых тэмпаў, каб дасягнуць конкрэтнага эфэкту у рабоце, усклаласці на старшынь ЦП саюзаў і Гарпрофсаветаў.

ЦСПСБ—Кавалёў.

Ганебныя сьведкі прарыву

ЛЁЗНА, 2. Плян першага кварталу па раёну выканан толькі на 43 проц. Рэалізацыя пазыкі праходзіць незадавальняюча.

Глоданскі сельсавет рэалізаваў пазыкі „5-годка ў 4 гады“ на суму 5000 руб., з якіх афармлена толькі на 1000.

Сельсаветы ня прымаюць конкрэтных захадаў да кулацка-заможнай часткі. Штрафы, ускладзеныя на кулацка-заможных гаспадаркі, не спаганяюцца. Слаба праходзіць рэалізацыя пазыкі „5-годка ў 4 гады“ па колгасах.

На ліквідацыю гэтага прарыву Лёзьненскі РК ЛКСМБ 25 сакавіка мобілізаваў 15 чал. з раённага актыву, якія накіраваны ў сельсаветы тэрмінам на 10 дзён.

М. Гузоўскі

„Друк—самая вострая і самая моцная зброя нашай партыі“ (СТАЛІН)

Кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор

Бязьлітасна змагацца супроць опортуністычнай недаацэнкі нізавога друку і рабселькораўскага руху

Пастанова

Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б па пытаньню організацыі масавага агляду-самаправеркі становішча нізавога друку, рабселькораўскага руху і партыйнага кіраўніцтва ім

1. Сэкратарыят ЦК КП(б)Б адабрае мерапрыемствы Менскага ГК КП(б)Б і Культпропу, ЦК КП(б)Б па пытаньнях забясьпечаньня сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам па гор. Менску.

2. Зацьвярджаючы мерапрыемствы Культпропу ЦК КП(б)Б па правядзеньню па БССР масавага агляду-самаправеркі работы нізавога друку, рабселькораўскага руху і партыйнага кіраўніцтва ім, Сэкратарыят ЦК КП(б)Б абавязвае усе ГК, РК КП(б)Б і рэдакцыі газэт правесьці гэты масавы агляд—самаправерку пад кутом яшчэ большага падвышэньня ролі і месца нізавога друку ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі за выкананьне прамфінпляну, за пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, за новы ўздым магутнай хвалі далейшага колгаснага прыліву, а таксама за няўхільнае ажыцьцяўленьне лёзунгу рабселькораўскага руху аб тым, што „кожны рабселькор-ударнік, кожны ударнік-рабселькор“. Правядзеньне масавага агляду-самаправеркі павінна быць непарыўна зьвязана з выкананьнем пастановы ЦК УсеКП(б) аб стварэньні да вясеньняй сяўбы ў кожным саўгасе, колгасе, МТС і насельным пункце насьценнай газэты а таксама з стварэньнем насьценных газэт у кожным цэху прадпрыемства і з вылучэньнем найбольш актыўных рабселькораў-ударнікаў на адказную работу ў рэдакцыі цэнтральных, гарадзкіх і раённых газэт.

3. Абавязаць рэдакцыі цэнтральных і раённых газэт шырока асьвятляць на сваіх старонках ход агляду-самаправеркі. Пасьля правядзеньня агляду вынікі павінны быць падагулены у спэцыяльных пастановах Бюро РК КП(б)Б.

4. Вынікі масавага агляду-самаправеркі, а таксама даклады. у выбарчым парадку, некалькіх РК КП(б)Б і рэдакцый гарадзкіх і раённых газэт з садакладамі Культпропу ЦК КП(б)Б заслухаць на Сэкратарыяце ЦК КП(б)Б.

5. Сэкратарыят ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што ўся партыйная організацыя у цэлым, кожная партыйная ячэйка паасобку нясе непасрэдную адказнасьць за сыстэматычнае кіраўніцтва і дапамогу нізавому друку і рабселькораўскаму руху.

Сэкратарыят ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што кожная праява недаацэнкі політычнага значэньня нізавога друку і рабселькораўскага руху павінна кваліфікавацца, як праява опортунізму на практыцы.

Пастанова

Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б па пытаньню популярызацыі работ усесаюзнай нарады па рабселькораўскаму руху і аб склікааньні ўсебеларускага зьезду корэспондэнтаў

1. Надаючы вялікае політычнае значэньне далейшаму ўзмацненьню рабселькораўскага руху, а таксама паляпшаньню сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва ім, Сэкратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе

а) Даручыць Гаркомам і РК КП(б)Б склікаць агульна-гарадзкія сходы партыйнага актыву, на якіх заслухаць даклад аб выніках усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху, увязаўшы абгав рэньне гэтага дакладу з прыняцьцем конкрэтных мерапрыем тваў па ўзмацненьню партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам.

б) Абавязаць Культпроп ЦК КП(б)Б забясьпечыць дакладчыкаў для 10 найбольш буйных гарадзкіх і раённых парторганізацый, а таксама праз БДВ выдаць матар'ялы аб выніках нарады і разаслаць па ўсіх Райкомах КП(б)Б.

в) Культпропу ЦК КП(б)Б разам з рэдакцыяй газэты „Зьвязда“ склікаць 5-га чэрвеня Ўсабеларускі зьезд рабселькораў з лікам удзельнікаў у 250 асоб. Організацыйную камісію па скліканьню зьезду зацьвердзіць у складзе т. т. Курцік КультпропЦК (старшыня), Мітлін—„Зьвязда“, Дунец—„Акцябр“, Вітлін, Красіна—„Рабочий“ Меляшкевіч—Камітэт па справах друку, Вержбаловіч—„Рабселькор“, Платаў—„Чырвоная Зьмена“, Шастакоў—„Савецкая Беларусь“ і Шмідт—„Колгасьнік Беларусі“.

Абвестку дню зьезду зацьвердзіць наступную:

1) Задачы друку ў трэцім, рашаючыу годзе пяцігодкі (дакладчыка вызначыць дадаткова);

2) Прывітаньне ад ЦО „Зьвязда“ (т. Будзінскі).

3) Задачы рабселькораўскага руху, партыйнае кіраўніцтва ім і ўдарніцтва ў друку (дакладчыкі т. т. Чарнушэвіч і Курцік).

4) Фабрычна-заводзкі нізавы друк у выкананьні задач 3-га, рашаючага году пяцігодкі (дакладчыкі т. т. Дунец і Красіна).

5) Колгасна-саўгасны і вясковы нізавы друк у соцыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі (дакладчык т. т. Шастакоў і Платаў),

6) Падрыхтоўка кадраў друку і пытаньне вылучэньня рабселькораў ударнікаў (дакладчык т. Вітлін).

Працяг работы зьезду орыентыровачна вызначыць у 5 дзён. Забясьпечыць удзел у зьезьдзе пэўнай групы партыйнага актыву, гаспадарнікаў і профсаюзных працаўнікоў.

г) З 15 красавіка па 15 мая правесьці па БССР кампанію перавыбараў рэдколегій фабрычна-заводзкіх, колгасных і вясковых нізавых газэт і шматтыражак. Кампаніі перавыбараў рэдколегій надаць характар адказнай політычнай кампаніі, праводзячы яе пад знакам яшчэ большага падвышэньня ролі друку і рабселькораўскага руху ў разгорнутым соцыялістычным наступе, выкананьня лёзунгу „кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор“, праверкі выкананьня ўсіх раней дадзеных партыйных дырэктыў па пытаньнях нізавога друку і рабселькораўскага руху.

д) Правядзеньне кампаніі перавыбароў рэдкол. газэт злучыць з папярэднім масавым аглядам—самаправеркай удзелу нізавога друку і рабселькораў у ажыцьцяўленьні важнейшых гаспадарча-політычных задач, якія зараз пастаўлены партыяй,

е) Абавязаць фракцыю ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ. ГК і РК КП(б)Б, рэдакцыі цэнтральных, раённых, фабрычна-заводзкіх, колгасных, вясковых і вайсковых газэт безадкладна разгарнуць шырокую сыстэматычную кампанію па падрыхтоўцы да Усебеларускага зьезду рабселькораў і перавыбараў рэдколегій шляхам шырокага асьвятленьня гэтых пытаньняў на старонках газэт, правядзеньня зьлёту—рабселькораў, справаздачы рэдколегій на шырокіх масавых сходах і г. д.

ж) Даручыць Культпропу ЦК КП(б)Б выпрацаваць да наступнага пасяджэньня Сэкратарыяту тэкст ліста ЦК КП(б)Б да парторганізацыі ў зьвязку з перавыбарамі рэдколегій насьценгазэт і падрыхтоўкаю да Усебеларускага зьезду рабселькораў.

ЦК ЛКСМБ, „ЧЗ“, ЦБ-ДКА і „ПБ“

Мы, піонэры і школьнікі Лоеўшчыны, сабраўшыся на першую раённую політэхнічную конфэрэнцыю школьнікаў, шлем шчырае прывітаньне кіраўніку і організатару комуністычнага выхаваньня дзетвары—ЦК ЛКСМБ і ЦБ ДКА і запэўніваем, што, пад кіраўніцтвам партыі і комсамолу, падагуліўшы сапраўднае становішча політэхнізацыі на раёне, возьмемся па-баявому, з усёй уласьцівай нам маладняцкай задорнасьцю за політэхнізм, каб стаць сапраўднымі будаўнікамі соцыялізму.

Прэзыдыум конфэрэнцыі м. Лоеў.

Узяць баявыя тэмпы ў ільнозагатоўках

Падрыхтоўка да сяўбы і контрактацыя павінны ня толькі не паслабляць, а наадварот стымуляваць загатоўкі

ЗМЫЦЬ ЧОРНУЮ ПЛЯМУ!

За зрыў выкананьня пляну ільнозагатовак „Зьвязда" занесла на чорную дошку Мазырскі, Чырвона-Слабодзкі, Сьвіслацкі, Нараўлянскі, Парыцкі, Чачэвіцкі, Юравіцкі, Расонскі і Рагачэўскі раёны.

Мы патрабуем ад сэкратароў ЛКСМБ Мазырскага—Калінкавіча, Чырвона-Слабодзкага—Грыбенко, Сьвіслацкага—Панасюка, Нараўлянскага—Ульлянава, Чачэвіцкага—Баранавай, і Рагачэўскага-Жданава—даць у трохдзённы тэрмін адказ: Чаму вы апынуліся на чорнай дошцы? Што вамі рабілася практычнага для выкананьня пляну ільнозагатовак? Якія вамі ўжыты захады для таго, каб зараз-жа зьняць сябе з чорнай дошкі, выканаць і перавыканаць плян ільнозагатовак?

Кожны сакратар райкамолу і ячэйкі нясе адказнасьць за выкананьне пляну ільназагатовак!

Менск, 4-IV—31 г.

Ільнозагатоўкі пад ударам. Тэмпы загатовак з пяцідзёнкі ў пяцідзёнку, замест павялічэньня даюць вялізарнае зьніжэньне. Так, калі з 20 па 25 сакавіка было загатоўлена 176,8 тон ільно-валакна, дык з 25 па 1 загатоўлена толькі 155 тон.

Такім чынам, з пачатку кампаніі па 1-е красавіка загатоўлена 9434,9 тоны, што складае толькі 39,1 проц.

Колгасны сэктар гадавое заданьне па загатоўцы выканаў усяго на 40,7 проц. Ад індывідуальнага сэктора па контрактацыі паступіла ўсяго 66,1 проц., а па звычайнай загатоўцы толькі 34,6 проц.

Дырэктывы ўраду па спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак бязчынна ігнаруюцца. Прокуратура шмат дзе ня ўжывае рэпрэсіўных мер да тых кулацка-заможных гаспадарак, якія сабатуюць загатоўкі.

Нельга ні ў якім разе абыйсьці моўчкі пераважную большасьць раённых комсамольскіх камітэтаў, якія не змаглі мобілізаваць комсамольцаў, батрацкую, колгасную, бядняцка-серадняцкую моладзь на выкананьне рэальных і ўпаўне магчымых плянаў ураду па ільнозагатоўках.

Мы сёньня заносім на чорную дошку Чырвона-Слабодзкі, Сьвіслацкі, Нараўлянскі, Мазырскі, Юравіцкі, Парыцкі, Чачэвіцкі, Рагачэўскі, Расьнянскі РК ЛКСМБ, у раёнах дзейнасьці якіх пляны ільнозагатовак выкананы ў мізэрных і ганебных лічбах—з 9 да 13 проц.

Мы запрашаем комсамольцаў Лёзьненскага раёну выступіць на старонках „Чырвонай Зьмены" і расказаць як яны змагаліся за кожнае кіло лёну і як яны дамагліся выкананьня і перавыкананьня пляну загатовак ільно-валакна.

Мы прапануем Лёзьненскай раённай організацыі узяць на грамадзкі буксір суміжныя раённыя організацыі комсамолу, якія адстаюць у загатоўках.

Пастанова

Бюро ЦК ЛКСМБ аб ходзе ільназагатовак, ад 31-III-31 г.

Адзначаючы, што ЦК КП(б)Б даў зусім правільную ацэнку ўдзелу ЛКСМБ у ільназагатоўках, аб тым, што сучасныя тэмпы работы па ўдзелу ў ільназагатоўках не забясьпечваюць выкананьня пляну, а частка РК ЛКСМБ праяўляе яўную права-опортуністычную практыку ў тым, што робяць стаўку на самацёк, не выяўляюць кулацка-заможных гаспадарак, не даабкладаюць цьвёрдымі заданьнямі скарачаюць пляны ільназагатовак, разважаюць аб нерэальнасьці плянаў, не вядуць масавай работы і г. д.

Бюро ЦК прапануе:

1) РК ЛКСМБ, на падставе дырэктыў ЦК КП(б),Б зараз-жа разгарнуць баявымі тэмпамі работу з тым, каб сапраўды забясьпечыць поўнае выкананьне пляну ільназагатовак, які магчымы і павінен быць выкананы;

2) даручыць орг. аддзелу праверыць раённыя камітэты, якія адстаюць у выкананьні ільназагатовак, каб выявіць магчымасьць пакінуць на кіруючай рабоце тых работнікаў, якія не забясьпечваюць поўнага выкананьня плянаў, а пасьля праверкі паставіць пытаньне аб перасоўцы іх на нізавую работу.

3) абавязаць таварышоў, якія выяжджаюць на пасеўкампанію, зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне плянаў ільназагатовак; пэрсанальна наступным т. т. выехаць ў ніжэйпералічаныя раёны:

т. Гуткіну—у Асьвею, Расоны; Рубінчыку—Ветрына, Барковіч; Пэрлінай—Касьцюковічы; Гурыну—Глуск; Вэнзэлю—Дуброўну; Хургелю—Бешанковічы Гейнэ—Клімавічы; Дубаву—Сураж; Гольдбэргу—Мсьціслаўль; Касьпяровічу—Чачэвіцы; а таксама перагледзець пасланыя брыгады з мэтай перасунуць іх у раёны, якія адстаюць у ільназагатоўках;

4) выклікаць з дакладамі аб ходзе ільназагатовак на Сэкратарыят ЦК ЛКСМБ, на 3-IV,—Рагачоўскі, Быхаўскі, Лядзянскі, Лепельскі, Аршанскі РК ЛКСМБ.

5. прапанаваць рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" узмацніць асьвятленьне ўдзелу комсамолу ў ільназагатоўках, мобілізуючы масы комсамольцаў і працоўнай моладзі на асноўнае выкананьне плянаў ільназагатовак.

Т. Бергер „тлумачыць"

БЯРЭЗІНА. 2 (Па тэлефону ад брыгады ЦК ЛКСМБ).—Ільназагатоўкі па раёну з пяцідзёнкі ў пяцідзёнку праходзяць нездавальняюча. У выніку чаго пляны загатовак на 28 сакавіка выкананы толькі на 23 проц.

Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак спагнаны толькі на 70 проц.

Райпрокуратура ня выканала дырэктывы НКЮ аб утварэньні паказальных судоў над кулацка-заможнымі гаспадаркамі, якія ўпарта ігнаруюць заданьні па здачы цьвёрдых заданьняў.

Мізэрнае выкананьне пляну ільназагатовак старшыня РВК т. Бергер „тлумачыць" гэта тым, што былі вельмі заняты леса-і каменя загатоўкамі, а льну здавалі мала браў.

З гэтых слоў здавалася, што загатоўкі леса і каменя па раёну выкананы на ўсе 100 проц., але дарэмна загатоўкі каменьня праходзяць яшчэ горш, чым ільназагатоўкі.

Асноўная прычына зрыву ільназагатовак—опортуністычная стаўка на самацёк і нежаданьне мабілізаваць шырокія масы колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне плянаў загатовак з боку кіраўніцтва, партыйных, комсамольскіх і савецкіх організацый раёну.

Комсамольская організацыя раёну на чале з бюро райкомам комсамолу ўвесь час загатовак стаялі ў баку і толькі зараз з прыездам брыгады ЦК ЛКСМБ наглядаецца некаторы зрух у мобілізацыі масы ў тым ліку і комсамольскіх вакол ільназагатовак, а таксама і зрух у выкананьні пляну апошніх.

„Чырвоная Зьмена" дапамагла

На заметку „Батрацтва ў загоне і недаглядзе" Бялыніцкі РК КСМ паведамляе, што факты адпавядаюць сапраўднасьці. Справа з батраком-вучнем уладжана, набыта вопратка і абутак за школьныя сродкі. Батрак Джыгіра зараз знаходзіцца на харчаваньні ў школе.

Дрыбінская РКК РСІ паведамляе, што факты, указаныя ў заметцы „Чаму не выпісаная газэта" пацьвердзіліся. РКК-РСІ зрабіла заўвагу загадчыку Дрыбінскага аддзяленьня сувязі і прапанавала палепшыць дастаўку газэт.

Заслаўская РКК РСІ паведамляе, што на расьсьледаваньне заметкі „Дрэнныя зьявішчы ў школе", факты антысэмітызму, варожых настрояў і п'яндзбайнасьці з боку настаўніцтва і адміністрацыі пацьвердзіліся.

Прапойская РКК РСІ паведамляе, што зьняць з працы загадчыка школы Пецікa, настаўніцу Назараву і настаўніка Касьпяровіча А іH.

Дапіс пад назвай „засьценкі" Сьмілавіцкім РК КП(б)Б перададзены ў судова-сьледчыя органы для высьвятленьня і прыцягненьня вінаватых.

Бешанковіцкія РКК-РСІ паведамляюць, што дапіс „Іх не цікавіць" пацьвердзіўся. Электроманцёр Хмызаў, які тармазіў праводку электрычных [illegible], зьняты з працы.

Лён ёсьць,—яго трэба ўзяць

У Глыбачанскім сельсавеце (Вульскі раён) загатоўка ільну і канапляў знаходзіцца ў палоне опортуністычнага самацёку. Сельсавет, партыйная і комсамольская ячэйка ўзна бязьдзейнічае. „Плады" самацёку,—плян выканан на 17 проц. Цьвёрдыя заданьні, дадзеныя кулакам і заможнікам, выкананы толькі на палову. У працаўніцкі сельсавету і ячэйкі пануе шкодная думка: быццам лёну няма, „з лёнам мы спазьніліся." Але факты гавораць аб адваротным.

Многія сяляне сельсавету (вёскі Васілевічы, Кабачок) лён прадаюць на рынку. Цікава такі факт. Вёска Васілевічы засявае многа лёну, а загатоўка яго зрывалася. Сяляне на сходах „ахвяроўвалі" на 1-2 кілёграмы льну. Калі ў вёсцы быў праведзены сход беднаты, а потым агульны сход, лён знайшоўся.

Загатоўлена больш як 100 кілёграм.

Лён ёсьць,—яго ня могуць толькі ўзяць. Трэба болей націснуць на кулака і заможніка, каб апошнія выканалі дадзеныя ім цьвёрдыя заданьні. Мобілізуючы грамадзкасьць, колгасна-бядняцкую масу, мы зможам выканаць пляны.

А. Усьмінскі.

Не закантрактавана ні аднаго га

ГРЭСК.—Райкоопсаюз ня склаў пляну праведзеньня контрактацыі яравых пасеваў. Па колгасах не прапрацавана здова і мерапрыемствы, якія вызначаюцца на контрактацыі.

На 13—III у раёне не закантрактавана ніводнага га яравых пасеваў. Комсамольская організацыя не паклапацілася на правядзеньне гэтага важнейшага гаспадарча-політычнага мерапрыемства.

Селькор Дыбаў

Праверыць сваячасовасьць выплаты заработнай платы

Усім КК-РСІ

Ня гледзячы на дырэктывы партыі і ўраду аб ліквідацыі запазычанасьці і забясьпечаньні сваячасовай выплаты зарплаты—да гэтага часу ў некаторых выпадках гэтыя дырэктывы парушаюцца.

НК РСІ БССР па заданьню НК РСІ СССР праводзіць масавую праверку сваячасовасьці выплаты зарплаты.

Праверка павінна устанавіць запазычанасьць па зарплаце на 1 красавіка, з разьбіўкай па галінах народнай гаспадаркі, рабочым і служачым з паказаньнем тэрміну ня выплаты.

КК-РСІ павінна праверыць правільнасьць падэбадных даных, Райбанкаў, устанавіць прычыны запазычанасьці з прыцягненьнем вінаватых да адказнасьці.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць на моманты парушэньня фінансавай дысцыпліны (выдаткаваньне сродкаў з фонду зарплаты на іншыя патрэбы).

Праверка павінна ахапіць усе раёны і праводзіцца з шырокім прыцягненьнем грамадзкасьці (стварэньне спэцыяльных брыгад рабочых для праверкі дзейнасьці Райбанкаў у гэтай галіне, а на прадпрыемствах—стварэньне спэцыяльных часовых кантрольных камісій.

Уся работа праводзіцца на месцох з удзелам профсаюзных органаў.

Усе матар'ялы павінны быць дасланы у НК-РСІ БССР не пазьней 15-га красавіка г. г.

Старшыня ЦКК КП(б)Б
Нарком РСІ БССР
Калнін

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

На ўсебеларускія курсы партыйна-комсамольскага актыву пры Бел. Ком. Унівэрсытэце імя У. І. Леніна на 1931-32 нав. год

1. Курсы комсамольскага актыву знаходзяцца пры Ком. Унівэрсытэце Беларусі імя Леніна і маюць на мэце падрыхтоўку кіручых комсамольскіх працаўнікоў раёну, колектыву і буйнай комсамольскай ячэйкі шляхам вывучэньня тэорыі і практыкі марксызму-ленінізму, гісторыі і практыкі саюзнай работы.

2. Тэрмін навучаньня на курсах аднагадовы.

3. На курсах праходзяцца агульна-адукацыйныя і грамадзкія дысцыпліны.

Агульна-адукацыйныя — беларуская мова і літаратура, прыродазнаўства з тэхнічным ухілам, матэматыка, эканомічная, фізычная і політычная геаграфія. Грамадзкія—гісторыя Комінтэрну ў сувязі з гісторыяй клясавай барацьбы на Захадзе, політэкономія і эканомполітыка, гісторыя УсеКП(б) і КП(б)Б у сувязі з гісторыяй народаў СССР, асновы марксызму-ленінізму, гісторыя юнацкага компуху, організацыя і мэтодыка комсамольскай работы і бягучыя політычныя падзеі.

4. На курсы прымаюцца сябры і кандыдаты КП(б)Б, комсамольцы з вытворчым стажам па вытворчасьці, альбо па найму ў с-гаспадарцы ня менш 3-х год, і сяляне колгасьнікі і бядпякі, працуючыя непасрэдна на с-г спадарцы пры ўмове 2-хгадовай актыўнай комсамольскай работы ва ўзросьце ад 17-20 год укл.

УВАГА: У адносінах да паступаючых комсамолак стаж актыўнай грамадзкай працы можа быць з ніжаны да 1 году і зрост ня звыш 21 году.

5. Падрыхтоўка павінна быць у наступным аб'ёме: па беларускай мове ўмець добра пісаць і выразна чытаць. Па матэматыцы умець рабіць арытмэтычныя дзеяньні над цэлымі і дробнымі, умець орыентавацца па карце і ведаць краіны сьвету. Па грамадзкіх дысцыплінах: гісторыя УсеКП(б), веды у аб'ёме падручніка Валасэвіча (самая кароткая гісторыя УсеКП(б), політэкономія ў аб'ёме падручніка Лівоньцьева (пачатковая політэкономія).

Гісторыя юнацкага руху па Шохіну, програма і статут УсеЛКСМ, пастановы 8-га і 9-га зьездаў УсеЛКСМ, 10-га зьезду ЛКСМБ, апошніх пленумаў ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ, орыентавацца ў бягучых падзеях у газэтах.

Програмы будуць высланы ўсім допушчаным да іспытаў па асабістых адрасох.

6. Асобы з заразнымі, у тым ліку і вэнэрычнымі хваробамі, нэурастэніяй, сухотамі і інш. прымацца на курсы ня будуць.

УВАГА: Інваліднасьць сама па сябе ня можа служыць перашкодай для паступленьня на курсы.

7. З мэтай папярэдняя праверкі, камандыраваныя павінны прайсьці праз адборачныя камісіі пры ГК і РК ЛКСМБ у складзе: загадчыка АПА, оргаддзелу і прадстаўніка ад РК КП(б)Б. Пры гэтай-жа камісіі праводзіцца мэдагляд. Камісіі павінны прыступіць да працы не пазьней 1-га красавіка і закончыць яе да 1-га мая з тым, каб адаслаць сьпісы кандыдатаў і матар'ялы на паступаючых у Комунівэрсытэт не пазьней 5-га мая 1931 г.

8 Дапушчаныя да іспытаў падрыхтоўваюцца і не пазьней 15-га верасьня 1931 г. накіроўваюцца ў Ком. Унівэрсытэт, у гор. Менск, дзе з 15 па 25-е верасьня утвараюцца іспыты курсантаў. Заняткі на курсах пачнуцца з 1-га кастрычніка 1931 г.

9. Асобы, якія ня вытрымаюць іспытаў, а таксама асобы, якія хоць вытрымаюць іспыты, але не зьявяцца да 15-га верасьня на курсы, будуць звярочвацца за кошт камандыруючых організацый на месца ранейшай працы, якая захоўваецца за паступаючымі да канчатковага залічэньня іх на курсы. Веды правяраюцца ў аб'ёме, паказаным у пункце 5. Камандыруючыя організацыі павінны:

а) паклапаціцца аб падарожных выдатках камандыруемых.

б) Прыняць на сабе апеку над сем'ямі камандыруемых.

в) Паклапаціцца, каб камандыруемыя мелі з сабой бялізну, абутак і вопратку.

г) Паклапаціцца аб разьліку на месцы працы і звальненьні курсантаў выходнай дапамогай,

д) Выслаць пастанову адборачнай камісіі, уласнаручна запоўненую курсантам асабовую картку, засьведчаную РК, жыцьцяпіс і характарыстыку аб грамадзкай працы не пазьней 1-га мая 1931 г. Астатнія дакумэнты: спраўка аб стане здароўя, расьпіску аб азнаямленьні з умовамі прыёму, спраўка аб апошняй працы паступаючыя павінны прывесьці з сабой. Без пералічаных дакамэнтаў накіроўваемыя кандыдаты да праверачных іспытаў дапушчаны ня будуць.

10. У Ком.Унівэрсітэце курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй і пасьцельнымі прыладамі.

11. З-за адсутнасьці інтэрнатаў для сямейных, з прычыны кватэрнага крызісу ў Менску, Комуністычны Унівэрсытэт не бярэ на сябе ніякай адказнасьці па забясьпечаньню кватэрамі сем'яў курсантаў.

12. Агульны набор курсантаў 120 асоб. Месцы разьмяркоўваюцца па раёнах паводле разьверсткі ЦК ЛКСМБ.

13. Пасьля сканчэньня курсаў, курсанты паступаюць у распараджэньне ЦК ЛКСМБ і скарыстоўваюцца на комсамольскай рабоце.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599